**УДК 94(476.4)**

# ГОРАД БЫХАЎ У XIV–XVIII стст.
# (УЗНІКНЕННЕ, РАЗВІЦЦЁ, ЭКАНОМІКА, ВАЙСКОВАЯ СПРАВА І РОЛЯ Ў РЭГІЁНЕ)

***Р.Д. ГАЛЫНСКІ***
***(Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова)***

*Горад Быхаў з'яўляецца адным з найменш даследаваных у гістарычным плане гарадоў Магілёўскага Падняпроўя, нягледзячы на тое, што горад граў значную ролю ў вайскова-палітычным жыцці Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай у XIV–XVIII стст. Гісторыя ўзнікнення Быхава і яго эвалюцыя да сёняшняга часу засталіся амаль не высветленымі. На падставе аналізу пісьмовых, картаграфічных і археалагічных крыніц давялося вылучыць некалькі стадый яго эвалюцыі, а таксама змянення ролі ў рэгіёне, як населенага пункта.*

***Ключавыя словы**: Быхаў, узнікненне горада, эвалюцыя горада, вайсковая справа, мілітарны цэнтр, "двор", горад-крэпасць, латыфундыя.*

**Уводзіны.** Адным з найменш вывучаных гарадоў магілёўскага Падняпроўя з'яўляецца Быхаў, нягледзячы на той факт, што ўрбаністычная традыцыя гэтага прыватнаўласніцкага горада ў XV–XVIII стст. істотным чынам уплывала на горадаўтваральныя працэсы, сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё мікрарэгіёна. Горад быў сталіцай Быхаўскага графства, найважнейшай магнацкай рэзідэнцыяй у рэгіёне Верхняга Падняпроўя. Тым больш не вызначана месца і значэнне Быхава ў сістэме горадабудаўнічай і сацыяльна-эканамічнай структуры Вялікага Княства Літоўскага.

Нажаль, на сёняшні дзень адсутнічаюць грунтоўныя даследаванні па гістарыяграфіі гэтага населенага пункта. У навуковай і навукова-папулярнай літаратуры дамінуюць невялікія сюжэты, якія ўскосна, апасродкавана тычацца гісторыі горада. Асобныя эпізоды з гістарычнага развіцця Быхава паказаны на фоне іншых урбаністычных комплексаў і прыватнаўласніцкіх гарадоў, прыводзяцца ў якасці дадатковых прыкладаў для ўмацавання аўтарскай аргументацыі.

Адназначна, горад Быхаў адыгрываў значную ролю ў вайсковых падзеях, што адбываліся на тэрыторыі сучасных беларускіх земляў сярэдзіны XVII – пачатку XVIII стст. Між іншым, больш ранняя гісторыя горада мае значную колькасць пытанняў, асабліва яго ўзнікненне і першыя стагоддзі існавання.

**Асноўная частка. Узнікненне.** Першая згадка Быхава змяшчаецца ў "Спісе гарадоў рускіх дальніх і бліжніх" і дэманструе яго ўмацаваным паселішчам (пад тэрмінам "паселішча", мы разумеем звычайны населены пункт, як гарадскога, так і вясковага тыпу – збіральны тэрмін) са складу Кіеўскіх гарадоў [1, с. 214–259; 2, с. 88–89]. Тэрмінам "горад" ці "град" у XIV ст. называлі ўмацаваныя аб'екты, якія мелі розныя ўмацаванні, нават і цэлыя абарончыя сістэмы (сцены, агароджы, валы і інш.) [3; 4]. На думку Л.В. Аляксеева ў XIV ст. Быхаў, разам з Рагачовам і Магілёвам, уваходзіў у склад Друцкага княства [5, с. 224–225; 6, с. 48]. На прыканцы XIV ст. горад, як і ўсё ўзбярэжжа Дняпра ад Шклова да Быхава, мог належаць князям Талочкавічам-Буйніцкім, ад якіх перайшоў да Кіева-Пячэрскага манастыра і князёў Крошынскіх [2, с. 87]. М.М. Ціхаміраў называе першым уладаром згаданых тэрыторый кіеўскага князя Скіргайлу Альгердавіча [1, с. 214–259; 2, с. 88–89]. У 1393 г. (В.Л. Насевіч ліча, што ў 1444 ці 1459 г.) князь Дзмітрый Сямёнавіч Зубравіцкі (1400? – пасля 1444 гг.) [2, с. 87] з роду князёў Друцкіх запісаў сваёй жонцы Зоф'і ўсю сваю маёмасць, у склад якой уваходзіў "двор Быхава" [7, с. 169; 8, с. 93]. Няясна, што тут мелася на ўвазе – двор як гаспадарка, паўнавартасны комплекс пабудоў з чэляддзю і землямі, ці горад цалкам. З гэтай прычыны падаецца верагодным, што ў XIV ст. Быхаў зяўляўся ўмацаванай сядзібай пры невялікім сельскім паселішчы, але, не горадам. Так, А.А. Трусаў звязвае паселішчы з назвай "двор" з паселішчамі феадалаў – сядзібамі [9, с. 34]. Дачка Дзмітрыя Сямёнавіча Зубравіцкага – Марына Гальшанская-Трабская падаравала Быхаў свайму ўнуку Альбрэхту Гаштольду ў 1496 г. [2, с. 93; 10, s. 58]. М.А. Волкаў адзначае, што Быхаў у крыніцах гэтага часу згадваўся і як "дворац" [7, с. 169], што пацвярджае нашу думку аб першапачатковым існаванні Быхава як умацаванай рэзідэнцыі-сядзібы. Пасля смерці Станіслава Гаштольда (сын Альбрэхта Гаштольда) Быхаў як "вымарачны" маёнтак адыйшоў ва ўласнасць Вялікага князя, які закладаў паселішча арандатарам.

М.А. Волкаў адзначае таксама, што Быхаўская воласць была падзелена паміж некалькімі ўладальнікамі, сярод якіх, акрамя Гаштольдаў, быў Іван Хадкевіч. Ад яго, маёнтак перайшоў яго сыну Аляксандру [7, с. 169]. Вынікае, што акрамя воласці магло быць падзелена і паселішча Быхаў.

Адміністрацыйна ў XVI ст. Быхаў уваходзіў у склад Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. Так да Віленскага сойма 1565–1566 гг. было складзена апісанне межаў Аршанскага павета, дзе Быхаўскія землі выступаюць у якасці памежных па рацэ Бярэзіне [8, с. 90].

На стратэгічнае значэнне Быхава звярнуў увагу Конрад Бабятынскі. Ім адзначана, што Быхаў знаходзіўся ў гэтак званай "Смаленскай браме" – адным з трох асноўных вайскова-стратэгічных маршрутаў паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскім Царствам (дарога са Смаленска на Слуцк) [11, с. 291–292]. Гэтая акалічнасць адыграла значную ролю ў яго далейшым існаванні. М.К. Любаўскі і А.П. Грыцкевіч адзначылі, што Быхаў з'яўляўся прыватнаўласніцкім паселішчам з катэгорыі "важнейшие княжеские и панские дворы при местах и селах". М.К. Любаўскі таксама выказаў думку, што шэраг мястэчак у XVI–XVII стст. ператварыліся ў гарады, а вёскі – ў мястэчкі, што гэта была звыклая з'ява ў згаданай эпосе [12, с. 33].

А.П. Грыцкевіч выказаў думку, што Быхаў узнік на месцы рамеснага паселішча, ці слабады, што ляжалі блізка да ўмацаванага гаспадарскага двара. Больш таго, ён адносіць Быхаў да старажытнарускіх гарадоў [12, с. 45]. Але гэтае сцвярджэнне памылковае, нават пры наяўнасці ў межах горада гарадзішча, бо няма дакладных згадак у пісьмовых крыніцах да якой катэгорыі паселішчаў адносіўся Быхаў у Старажытнарускі час. У сваю чаргу, В.М. Ляўко звярнула ўвагу на тое, што шэраг гарадзішчаў VIII–X стст., пераўтварыўся ў гарады, замкі, крэпасці і феадальныя двары. Кожная са згаданых катэгорый паселішчаў мае свае асабістыя прыкметы, але незаўжды гэтыя прыкметы выразныя. Больш таго, у розныя часы паселішча магло адносіцца да розных катэгорый, і Быхаў – не выключэнне [8, с. 75].

Ю.М. Бохан у сваіх даследаваннях выказваўся, што шэраг гарадоў з'яўляўся ў пісьмовых крыніцах са спазненнем. Акрамя таго, застаецца адкрытым пытанне: ці былі згаданыя ў пісьмовых крыніцах XV ст. паселішчы гарадамі? Гэтае пытанне, на яго думку, больш за ўсё тычыцца Быхава і Рэчыцы. Першы населены пункт быў "дваром"-сядзібай і "местам", а горадам у поўным сэнсе слова стаў толькі ў XVI ст. Другі, маючы замак, – горадам стаў звацца толькі ў 1520-я гг., пасля разбудовы гарадской пляцоўкі [7, с. 199; 8, с. 7]. Так ці інакш, час першых згадак Быхава ў пісьмовых крыніцах канца XIV–XV стст. Ю.М. Бохан характарызуе хуткім павелічэннем паселішчаў гарадскога тыпу на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Звязвае ён гэты працэс з інтэнсіфікацыяй эканамічнага развіцця ВКЛ, уключэннем у грашовы абарот сялянскіх масс (выплаты грашовых рэнт) [13, с. 199; 14, с. 7].

На нашу думку, XIV ст. – гэта перыяд значных катаклізмаў – эпідэмія чумы "Чорная смерць" і татарскія набегі на тэрыторыю сучаснай Украіны. З аднаго боку, гэта прывяло да абязлюдзення Старажытнарускіх гарадскіх цэнтраў. З другога, – людскія массы, каб пазбегнуць татарскага палона, прасоўваліся на поўнач і пераходзілі пад уладу гаспадароў, якія надзялялі іх зямлёй. Акрамя таго, у гэты час ішла феадалізацыя тэрыторыі – феадалы "асядалі на зямлю" – перасяленне ва ўласныя маёнткі падораныя сеньёрам – гэтак званае "абаярванне" дружыны. З гэтай прычыны частка насельніцтва гарадоў пераходзіла ў феадальныя сядзібы каб забяспечваць іх уладальнікаў рамеснай прадукцыяй [13, с. 199, 262; 14, с. 7]. Усе гэтыя фактары ўплывалі на павелічэнне колькасці "сядзіб"-двароў і іх несельніцтва, што прыводзіла да трансфармацыі апошніх ў мястэчкі і "месцы", у той жа час, да скарачэння насельніцтва гарадоў. На падставе адзначанага вынікае, што ў канцы XIV–XV стст. Быхаў не мог з'яўляцца паўнавартасным горадам. Ён з'яўляўся сельскім паселішчам з умацаванай рэзідэнцыяй ("дваром"-сядзібай). Па сутнасці, гэта быў протазамак. Як ён дакладна выглядаў, – нам невядома.

У першай палове XVI ст. быхаўчане атрымалі права на знешні гандаль, што пазначала юрыдычнае замацоўванне Быхава як "места" (горада) [7, с. 169]. Тэрмін "места" як назва горада вядомы з XIII ст., ён азначаў паселішча гарадскога тыпу, адрознае ад замка. Месца магло быць умацаванае (звычайна драўляназемлянымі ўмацаваннямі) або неўмацаванае. Другасныя кварталы, якія не былі ахоплены гарадскімі ўмацаваннямі, або аддзелены ад іх прыроднымі перашкодамі, называліся прадмесцямі. Невялікія гарадкі звалі мястэчкамі [15, с. 302]. Местам таксама называлі вакольны горад [17, с. 256–257]. Зыходзячы з гэтага, да першай паловы XVI ст. Быхаў з'яўляўся мястэчкам. Мястэчкі вельмі часта разбудоўваліся вакол феадальных сядзіб, якія выконвалі ролю гаспадарчага і адміністрцыйнага цэнтра воласці. Гэтая катэгорыя паселішчаў мела дзве асаблівасці – значная роля гандлю і дамінаванне сельскай гаспадаркі над рамяством. Так мястэчкі вялі гандаль на невялікай адлегласці, тады як гарады распаўсюджвалі сваю прадукцыю і тавары ў замежжа [8, с. 91]. Між тым, Быхаў яшчэ не згадваецца як горад.

Цяжкасці ў вызначэнні адмежавання горада ад мястэчка, кансалідуюцца ў сістэме размеркавання гарадоў у першакрыніцах. Так, горад (*civitas*) і мястэчка (*oppidum*) не мелі прававога вызначэння, градацыя ішла выключна па якасных паказчыках – вялікія і малыя. У падаткаабкладанні выкарыстоўвалі наступныя назвы: найвялікшыя, галоўныя, лепшыя, вялікія, першасныя гарады. Потым ішлі мястэчкі: малыя, меньшыя і горшыя гарады. Гэтая сістэма была ўмоўнай і не надта трывалай [12, с. 33–34].

**Эвалюцыя.** Пры разглядванні эвалюцыі Быхава, на нашу думку, трэба прытрымлівацца ідэі З.Ю. Капыскага і А.П. Грыцкевіча – абапірацца на памеры горада. Даследчыкі звязваюць Быхаў пачатку XVII ст. з сярэднімі па памеры гарадамі (ад 3 да 10 тыс. чалавек). У канцы XVII ст. – Быхаў ужо буйны горад (10 і больш тыс. жыхароў), а ў XVIII ст. – зноў сярэдні [12, с. 38–39]. Да сярэдніх гарадоў адносіць Быхаў і Ю.М. Бохан [13, с. 204; 14, с. 13]. Але мы ня ведаем дакладнай колькасці насельніцтва Быхава ў згаданыя перыяды і зыходзячы з якіх крыніц гісторыкі рабілі падлікі. Таму выпадае арыентавацца толькі на згадкі ў пісьмовых крыніцах і асноўныя функцыі, якія магло выконваць паселішча ў розныя часы яго існавання.

У 1540-х гадах Станіслаў Гаштольд і Аляксандр Хадкевіч мелі сваіх асобных ураднікаў у Быхаве [7, с. 170]. Зыходзячы з гэтага, тут маглі існаваць і два асобныя “двары”, а значыць і двое замкаў. У 1556 г. Рыгор Хадкевіч атрымаў ад Жыгімонта II Аўгуста шэраг зямельных уладанняў, сярод якіх і “двор” Быхаў з вёскамі. Па назіраннях М.А. Волкава, гэта трэцяя частка Быхаўскай воласці, якая пазней звалася “Новы Быхаў” [3, с. 170]. Раней гэтыя тэрыторыі належалі Івану Васільевічу Саламарэцкаму. У 1560 г. Марыя Янава Гарнастай прадала сваю застаўную частку Быхава Гераніму Хадківічу. Так вакол Быхава ўтварылася вялікая зямельная латыфундыя ў руках аднаго магнацкага рода – Геранімa і Рыгора Хадкевічаў, потым усё перайшло да сына Геранімa – Яна [3, с. 171].

У 1560 г. ад Вялікага князя Рыгорам Хадкевічам быў атрыманы прывілей на будаўніцтва горада і замка [3, с. 171]. Так, мы бачым, што казаць пра Быхаў у якасці горада можна з сярэдзіны XVI ст., але мы не ведаем, пра які канкрэтна населены пункт ішла гаворка ў прывілеі. На той момант ужо існавалі ў нязначнай адлегласці адзін ад аднаго два Быхава і ў другой палове XVI ст. абодва мелі драўляна-земляныя замкі. На думку М.А. Волкава, будаўніцтва драўляна-землянога замка і правільнай геаметрычнай гарадской забудовы было распачата на месцы будучага мястэчка Новы Быхаў [3, с. 171]. Але найбольш верагодна, горад быў проста перанесены на некалькі сот метраў на поўнач. Гэта было звязана, на нашу думку, з поўным зборам у руках аднаго рода ўсіх Быхаўскіх зямель. Ускосна, гэта пацвярджае і той факт, што ў 1560–1570 гг. Ян Хадкевіч праводзіў лакацыю – заклаў новы горад з рэгулярнай планіроўкай і гандлёвай плошчай. Як вядома, з часоў Старажытнай Русі гарады разрасталіся веерна ці радыяльна ад дзядзінца. Такую ролю ў Быхаве адыгрывала паўднёвае гарадзішча. Больш таго, калі тэрін “дзядзінец” атаясамляецца з тэрмінам “сядзіба” і “двор”, падаецца верагодным першапачатковае месцазнаходжанне “старажытнага” Быхава на тэрыторыі паўднёвага гарадзішча.

Перанос замка і “места” перажыў і Шклоў, калі правесці аналогію паміж Шкловам і Быхавам, выяўляюцца пэўныя падабенствы. “Места Шклоўскае” было закладзена на аддаленасці (4 км) ад феадальнага двара-сядзібы. Быхаў таксама быў перанесены прыкладна на 800 м (па меркаванні М.А. Волкава, за 20 км ад сучаснага агр. Новы Быхаў да сучаснага горада Быхава [3, с. 171]). Абодва паселішчы (Шклоў і Быхаў) належалі Хадкевічам. Абодва места ляжалі на гандлёвых шляхах: сухапутным Віцебск – Гомель і рачным – Днепр. В.М. Ляўко бачыць галоўнай прычынай павелічэння сеткі гарадскіх паселішчаў у Падняпроўі будаўніцтва канала паміж рэкамі Зах. Дзвіна і Днепр у ваколіцах Воршы ў другой палове XVI ст. Больш таго, у XVI – пачатку XVII стст. кіраўніцтва дзяржавы ўсяляка падтрымлівала шляхту ў разбудове гандлёвых паселішчаў уздоўж Дняпра [8, с. 107].

У 1560–1570 гг. Ян Хадкевіч разам з бацькам, Геранімам Хадкевічам, будаваў новы драўляна-земляны замак. Але такія ўмацаванні не адпавядалі рэаліям баявых дзеянняў канца XVI ст., што прывяло да новых змен. Важна адзначыць, што мела месца вядзенне баявых дзеянняў на Магілёўшчыне падчас Інфлянцкай вайны (1558–1583 гг.). У гэты час Быхаў быў захоплены маскоўскімі войскамі, з яго вывозяць артылерыю [16, с. 224]. Але ў верасні 1568 г. з Быхава і Магілёва на будаўнічыя работы ў Вулу Хадкевічы накіравалі 300 чалавек [18, с. 114]. Быхаў тут – прыватны горад, тады як Магілёў накіроўваў людзей пад уплывам адміністрацыйна-вайсковага рэсурсу Хадкевічаў. Гэта дэманструе нам горад, які развіваецца, бо будаўнічыя работы на новым замку патрабавалі дастатковай колькасці працоўных, тады як факт адпраўкі людзей ў Вулу дэманструе ўжо сфармаваны горад з пэўнай колькасцю свабодных ад пастаяннай працы людзей. Але, магчыма, гэта была чэлядзь, альбо прыгонныя, якія раней працавалі на будаўнічых работах. У 1568 г. Быхаў разам са Шкловам, Слуцкам і Мышшу былі ўключаны ў тытулатуру Яна Караля Хадкевіча, як графскія землі [8, с. 95].

У 1590 г. замак моцна пацярпеў ад нападу атрада «нізавых казакоў» данскога гетмана Мацюшы Федаровіча, якія, «*наехавші гвалтовне..., шкоды немалые... пачінілі*». У варотах брамы і ў драўляных сценах засталіся «*есьмо куль і стрел немало*» [19, с. 81]. Зімой 1595 г. пасля разгрому Магілёва праз Быхаў на Рэчыцу, праходзіў атрад Севярына Налівайкі. Гэтыя падзеі сталі прычынай перабудовы замка. Дарэчы, Ян Караль толькі ў 1601 г. стаў адзінаасобным уладаром Быхава. У 1611 г. ён пачаў узводзіць быстыённыя ўмацаванні. Вядома, што Ян Станіслаў Сапега (зяць Яна Караля Хадкевіча) дабудоўваў каменную рэзідэнцыю.

А.П. Грыцкевіч звязвае будаўніцтва Быхаўскага замка з Янам Карелем Хадкевічам і датуе яго 1590–1610 гг. Адзначае ён таксама і падабенства Быхаўскіх будаўнічых работ па фарміраванні фартыфікацыйных комплексаў са Шклоўскімі [19, с. 46].

Найбольш аб’ектыўна прычыны разбудовы менавіта Быхаўскай латыфундыі абгрунтаваў М.А. Волкаў. Верагодна, гэта тлумачыцца рознымі функцыямі і ролямі асноўных сядзіб Яна Караля Хадкевіча (Ляхавічы і Быхаў). Магутны бастыённы замак у Ляхавічах уяўляў сабой рэзідэнцыю новага тыпу, якая акрамя забеспячэння надзейнай абароны з’яўлялася таксама новай формай рэпрэзентацыі палітычнага і сацыяльнага статуса яго ўласніка. Выбар Ляхавічаў для ўзвядзення сядзібы такога кшталту тлумачыцца блізкасцю паселішча да палітычных цэнтраў дзяржавы. У сваю чаргу, Быхаў знаходзіўся на ўсходняй мяжы дзяржавы і магчымасці яго выкарыстання для рэпрэзентацыі ў палітычнай дзейнасці былі абмежаваныя. Аднак гэтае паселішча было цэнтрам найбольшай зямельнай латыфундыі Я.К. Хадкевіча, а яго жыхары атрымлівалі значныя прыбыткі ад гандлю па Дняпры. Таму асноўныя высілкі былі скіраваны на ўзвядзенне абарончых умацаванняў вакол самога паселішча. Пераўтварэнне Быхава ў горад-фартэцыю

давала магчымасць забяспечыць абарону мяшчанам, а разам з тым, дэмаграфічнага і эканамічнага патэнцыялу ўсёй латыфундыі. Між тым, будаўнічыя работы на замку вяліся яшчэ ў 1630-я гг. Так, у 1637 г. выраблялiся замкі, завесы і іншыя слесарскія работы, дзеля паўнавартаснага забеспячэння функцыянавання замка. Але абарончы патэнцыял замка ў Быхаве, пасля яго перабудовы Я. К. Хадкевічам і яго наступнікам Я. С. Сапегай, знізіўся. Новазбудаваная мураваная рэзідэнцыя выконвала найперш рэпрэзентацыйныя і адміністрацыйныя функцыі [7, с. 167–194; 20, с. 81]. Асноўная стаўка ў абароне горада ўскладалася на сістэму бастыёнаў і правільную гарадскую забудову з каменнымі будынкамі ў ёй. Так, Ляхавічы выконвалі ролю апоры ў палітычным жыцці Хадкевічаў і Сапегаў, а Быхаў дэманстраваў вайсковую моц, бо з’яўляўся ўжо горадам-крэпасцю.

Трэба адзначыць, што вонкавы выгляд забудовы горада, яго ўмацаванняў і замка ўвогуле пастулова змяняліся. Замак і горад моцна пацярпелі ад вайны Рэчы Паспалітай з Масквой (неаднаразовыя аблогі як польскіх, так і расійскіх ды казацкіх войск). Так, асобна на аднаўленне замка і гарадскіх умацаванняў у 1669 г. кароль выдаткаваў прывілеі быхаўскім мяшчанам, якімі скасоўваў выплаты падаткаў [21, с. 46–48, 177–182]. Увогуле, у гады Казацка-сялянскай вайны (1648–1649 гг.), вайны Расіі з Рэччу Паспалітай (1654–1667 гг.), вайны магнацкіх груповак (1696–1702 гг.) і Паўночнай (1700–1721 гг.) вайны Быхаў быў шэсць разоў у шматмесячных аблогах, ва ўсіх выпадках у горадзе былі разбурэнні і пажары, якія закранулі і замкавы комплекс. Найбольшыя разбурэнні замак пацярпеў падчас асады 1702 г. – яго бамбардзіравалі з “Галандкі” – вялікай мартыры. Падчас бамбардзіровак горада былі пашкоджаны цэйхгаўз і паўночная глухая сцяна замкавага комплекса. У 1716 г. гарадскія брамы ўвогуле былі ўзарваныя, а частка вонкавых умацаванняў зрыта адыходзячым расійскім гарнізонам. Пастулова Сапегі здолелі аднавіць сістэму ўмацаванняў і адбудаваць брамы [22–23].

Пасля ўваходжання Усходняй Беларусі ў склад Расійскай Імперыі (1772 г.), Стары Быхаў некаторы час быў аб’ектам пільнай увагі з боку расійскіх ваенных, бо новая мяжа паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай прайшла па тэрыторыі цяперашняга Быхаўскага раёна – па р. Друць. Для вывучэння на месцы абарончых магчымасцей крэпасцей у Беларусь быў накіраваны ваенны інжынер Ф.В. Баўр. У сваім дакладзе 1782 г. ён прапанаваў на заходніх межах Расійскай Імперыі заснаваць дзве галоўныя крэпасці: новую, каля «места» Будзілава, і рэканструяваную, у Старым Быхаве. Пры апошняй на выгоднай гары каля Рагачова планавалася «пабудаваць цытадэль ці невялікае ўмацаванне, якое магло прыкрываць перавоз па Дняпры і Друці». У прамежках паміж галоўнымі крэпасцямі патрабавалася размясціць меньшыя крэпасці ў Талачыне, Дрысе і Дынабургу [24, с. 72]. Аднак далейшыя падзелы Рэчы Паспалітай зрабілі гэтыя планы немэтазгоднымі, бо мяжа Расійскай Імперыі адсунулася далёка на захад. Таму Быхаў страціў сваё стратэгічнае значэнне горада-крэпасці, а яго ўмацаванні пастулова прыйшлі ў заняпад і былі разбураны і ў значнай долі разабраныя. У першай палове XIX ст. мясцовыя жыхары разрылі бастыёны і курціны, а ў другой – разабралі на цэглу ўяздныя брамы.

**Эканоміка.** У Быхаве, як і ў шэрагу іншых гарадоў, рамесніцкая дзейнасць была дамінуючым заняткам у параўнанні з сельскай гаспадаркай і промысламі. Пра гэта кажуць пісьмовыя і археалагічныя крыніцы. Рамеснікі, якія прысутнічалі ў горадзе ў XVI–XVIII стст., працавалі са скурай і мехам, тканінай, займаліся апрацоўкай металаў і вырабам зброі, драўніны, вырабам харчовай прадукцыі, будаўніцтвам, а таксама выконвалі транспартныя ды іншыя сацыяльныя (цырульнікі, мяснікі, пекары, бровары і г.д.) паслугі. Разам з тым, у адрозненні ад большасці беларускіх гарадоў таго часу, асноўную ролю ў Быхаве адыгрываў выраб зброі. Гэта была рамесная спецыялізацыя горада, выкліканая наяўнасцю людвісарні і мэтавай палітыкі гаспадароў (выраб пораху, адліўка гармат і ядраў, выраб агнявальнай і халоднай зброі, засцерагальнага ўзбраення). Гэта было неабходна для забеспячэння функцыянавання мясцовай адміністрацыі, гарнізона, збройнікаў і выканання экспартных паставак узбраення на рынкі Усходняй і Цэнтральнай Еўропы [25, с. 20–28; 26, с. 115–122].

Найбольш якасным відам комплекснага рамяства, адпавядаючым усім еўрапейскім крытэрыям таго часу, было надзвычай высока развітае ў Быхаве збройніцтва. Ім займаліся людвісары (адліўка гармат і званоў), збройнікі, панцырнікі (выраб даспехаў), мечнікі (выраблялі халодную зброю), “ювеліры-наводчыкі” (майстры якія аздаблялі халодную і ахоўную зброю). Для іх паўнавартаснай працы неабходны былі кавалі, цесляры і слесары. У горадзе існавалі шаўцы, краўцы, шорнікі, гарбары, ганчары, гутнікі (выраблялі шкло) і іншыя спецыяльнасці. У Быхаве таксама працавалі бровары і млынары. Цырульнікі забяспечвалі асноўныя мерапрыемствы па ахове здароўя, займаліся хірургіяй і праводзілі санітарна-эпідэміялагічныя мерапрыемствы ў горадзе [12, с. 65–66, 74, 81, 84; 27, с. 19–20; 28; 25, с. 20–28]. Наяўнасць у інвентарах прылад працы і разнастайных прыстасаванняў для апрацоўкі металаў указвае на высокае развіццё мясцовай апрацоўкі чорных і каляровых металаў. Аб гэтым кажуць і згадкі значнай колькасці майстроў (асабліва ювеліраў) і непасрэдныя згадкі пра выраб у Быхаве званоў, гармат і ўзбраення [12, с. 65–66].

Прысутнасць у Быхаве ювеліраў ускосна пацвярджае мясцовы выраб разнастайных аксэсуараў і прадметаў упрыгожвання адзення. Згадкі броварў, тартаку, вадзяного млына і разнастайных прыстасаванняў і прылад (таксама выяўленых археалагічна) дэманструюць шырокі спектр спецыяльнасцей і заняткаў па апрацоўцы арганічнай сыравіны (шаўцы, краўцы, бондары, цесяры, токары і інш.) [25, с. 20–28]. Наяўнасць шкляных вырабаў з геральдычнай сімволікай Сапегаў з’яляецца пацвярджэннем існавання шкловытворчых гут у непасрэднай блізасці ад горада ў другой трэці XVII ст. [25, с. 20–28].

Керамічны матэрыял у сваёй большасці з'яўляўся шэраговым і, верагодна, быў мясцовага паходжання. Імпарт керамікі быў звязаны з тытунёвымі люлькамі, кафляй, дахоўкай, белагліняным посудам і "каменным таварам" (рэйнскай керамікай). Частка чырвонаглінянага посуду імпартавалася з іншых гарадоў Беларусі [25, с. 20–28; 29, с.44–50; 30; 31; 32].

У пісьмовых крыніцах адсутнічаюць звесткі пра выраб адзення, але маюцца ўскосныя сведчанні здабычы сыравіны для яго вырабу – футра (бабровае). Наяўнасць значнай колькасці спрацаваных абутковых падковак дэманструе прысутнасць спецыялістаў па рамонце абутку, магчыма і адзення. Комплекс адзення з канца XVI–XVIII стст. у асноўным арыентаваўся на заходне- і цэнтральнаеўрапейскія традыцыі (Венгрыя, Польшча, Германія). Гэта звязана з мілітарызацыяй грамадства, вялікай колькасцю заходнееўрапейскіх наёмнікаў, імкнення мясцовай шляхты і магнатэрыі да заходнееўрапейскіх вайсковых і шляхетных традыцый. XVII–XVIII стст. характарызуе наяўнасць мясцовай моды – сарматызму [33; 34].

Дакладна высветлены гарады, з якімі найбольш інтэнсіўна гандляваў Быхаў – Магілёў, Масква, Гародня, Вільня, Каралявец (Кёнігсберг), Кіеў. Выход на міжнародны гандлёвы рынак Быхава адбыўся ў 1530-я гг. Да экспартных тавараў адносіліся: збожжа, зброя, лес. Імпартаваліся: жалеза, шляхетныя металы, салетра і сера, прадметы раскошы, тытунь [7]. Месца размяшчэнне горада на Дняпры, наяўнасць замка, людвісарні і кантраляванне сухапутных шляхоў з поўначы на поўдзень уздоўж Дняпра, моцныя фартыфікацыйныя ўмацаванні рабілі Быхаў важным гандлёва-рамесным цэнтрам Беларускага Падняпроўя. Найбольшае значэнне горад набывае з канца XVI стст. (як цэнтр вельмі вялікай магнацкай латыфундыі), пік яго развіцця прыпадае на пач. XVII ст. З сярэдзіны XVIII ст. горад пачынае заняпадаць у сацыяльна-эканамічным плане, нягледзячы на паступовую рэканструкцыю гарадской забудовы.

**Вайсковая справа.** Быхаўскі гарнізон складаўся з наёмнікаў, мясцовых выбранцаў і апалчэнцаў (падчас аблог). Жаўнеры забяспечваліся за кошт магнатаў, апалчэнцы – за ўласны кошт. Баяздольнасць гарнізона кантралявалася і падтрымлівалася на дастатковым узроўні. Стары Быхаў прымаў непасрэдны ўдзел у вайсковых канфліктах канца XVI – пачатку XVIII стст. Доўгатэрміновыя аблогі з'яўляюцца красамоўным паказчыкам таго, што горад з'яўляўся добраўмацаванай і ўзброенай цытадэллю, "ідэальным горадам-крэпасцю". Хаця асноўнае прызначэнне самога палацава-замкаага комплекса – рэпрэзентацыя моцы і ўлады Хадкевічаў і Сапегаў.

Да сярэдзіны XVI ст. Быхаў баранілі самі ўладары са сваімі вайсковымі слугамі і кантынгентамі залежных ад іх рыцараў і баявых слуг. Другая палова XVI–XVII стст. характарызуецца распаўсюджваннем ўжывання паслуг наёмнікаў пры абароне гарадоў і замкаў. Мяшчанскае апалчэнне фарміравалася па дзесяцічна-соценнаму прынцыпу, што з'яўляецца водгуллем старажытнарускага гарадскога дзялення. Падчас зацяжных войн у горадзе фарміраваліся баявыя падраздзяленні з ліку бежанцаў. Яскравым прыкладам служаць часы казацка-сялянскай вайны, калі з уцекачоў-яўрэяў быў сфарміраваны "яўрэйскі полк", а з навакольнай гомельскай і рэчыцкай шляхты, колькасць якой дасягала 300 чалавек, – харугва.

Быхаўскія мяшчане, шляхта і жаўнеры мелі на ўзбраенні разнастайную агняпальную, халодную і засцерагальную зброю. Шмат зброі выраблялася мясцовымі майстрамі. Так, сярод мілітарый трэба адзначыць панцыры, місюркі, наручы-карвашы. З агняпальнай: разнастайныя гарматы, мартыры, арганы, вінтоўкі, аркебузы, пташыны, гакаўніцы, пішчалі, пісталеты з разнастайнымі замкамі (крамянёвыя, кнотавыя, губчастыя, колкавыя і інш.). Халодная: шаблі, канчары, палашы, мячы, шпагі, нажы і кінжалы; буздыганы, сякеркі, абушкі, бярдышы, пратазаны; рагаціны, вошчапы, пікі, баявыя косы. Акрамя таго выкарытоўвалі лукі са стрэламі. І, канешне, разнастайны рыштунак для верхавой язды [35, с. 30–35; 36, с. 9–10].

**Роля ў рэгіёне.** Быхаў узнік з сельскага паселішча, з цягам часу вылучыўшыся ў цэнтр сельскай акругі. Верагодна, яшчэ ў старажытнарускі час гэтае паселішча адыгрывала пэўную ролю як гандлёвая кропка на Дняпроўскім шляху "з вараг у грэкі". Аб гэтым сведчаць курганныя могільнікі ў ваколіцах Быхава, што ўражваюць сваім багаццем. З уваходжаннем Падняпроўя і ўкраінскіх зямель у склад ВКЛ Быхаў апынуўся ў памежным становішчы, выступаючы як парубежны населены пункт. З гэтай прычыны ён мог быць перададзены ў якасці леннага, ці беніфіцыяльнага, валодання, што дало падставы для пераўтварэння яго ў абарончую кропку ("двор"). З пераходам у валоданне Хадкевічаў Быхаў пачынае інтэнсіўна развівацца і эвалюцыянуе ў паўнавартасны горад з паступовай разбудовай замка/замкаў і гарадской забудовы па апошніх еўрапейскіх іннавацыйных тэхналогіях у фартыфікацыі і горадабудаўніцтве.

Асноўныя функцыі Быхава ў часы Хадкевічаў і Сапегаў – абарончая, рэпрэзентацыйная і эканамічная. Быхаў з'яўляўся цэнтрам адной з буйнейшых магнацкіх латыфундый, размешчаных на ўсходнім памежжы Рэчы Паспалітай, адначасова горад быў галоўным збройніцкім цэнтрам у рэгіёне. З XVII па канец XVIII стст. Быхаў адыгрываў ролю асноўнага мілітарнага цэнтра на Падняпроўі з-за першакласных умацаванняў і наяўнасці збраёвых майстэрняў (у тым ліку і людвісарні). Істотную крыніцу прыбыткаў горада складаў менавіта экспарт зброі і рыштунку.

Улічваючы максімальную адаптацыю гарадской забудовы да фартыфікацыйных функцый, наяўнасць першакласнай абарончай сістэмы ўмацаванняў, мясцовы выраб узбраення і пастаяннага кантролю ўладароў за абароназдольнасцю горада, можна казаць аб першапачатковай функцыі Быхава як горада-

крэпасці. Другая функцыя – рэпрэзентацыя магутнасці гаспадароў паселішча. Горад, размешчаны на высокім левым беразе Дняпра, – гэта аптымальнае месца для будавання крэпасці, якая не з'яўляецца памежным фарпостам. Судаходны Днепр усё ж не забяспечваў тавараабарот, роўны Заходняй Дзвіне ці Нёману, адкуль тавар ішоў у Балтыку, але быў дастатковым для лагістычнага забеспячэння прыфрантавых рэгіёнаў у выпадку вайсковага канфлікта. Эканамічны, адміністрацыйны і рэлігійны цэнтр – толькі на трэцяй пазіцыі.

**Заключэнне.** У сучаснай гістарыяграфіі вывучэння горада Быхава вылучаюцца тры асноўныя этапы, якія падзяляюцца як храналагічна, так і якасна. Першы – XIX – сярэдзіна XX стст., гэты час характарызуецца шматлікімі кампіляцыямі з працы польскага гісторыка М. Балінскага і вылучаецца значнай фрагментаванасцю ведаў. Другі – канец 50-х – пачатак 80-х гг. XX ст. – першыя археалагічныя даследаванні на тэрыторыі горада і агульнагістарычныя даследаванні па беларускай сярэднявечнай урбаністыцы, у якіх прыводзяцца згадкі пра Быхаў падчас аналіза эканамічнй, палітычнай і сацыяльнай гісторыі Беларусі. Трэці – з канеца 1980-х гг. па цяперашні час – паўнавартасныя даследаванні гісторыі і археалогіі горада.

У генэзісе Быхава як населенага пункта вылучаецца пяць асноўных этапаў:

– сельскае паселішча з феадальным дваром – XIV ст.;

– умацаваная сядзіба-замак XV ст.;

– паселішча з некалькімі умацаванымі сядзібамі-замкамі (да трох) – пачатак XVI ст.;

– прыватнаўласніцкі горад з паўнавартасным замкам, які адначасова з'яўляўся цэнтрам латыфундыі і Быхаўскага графства з драўляна-земляным замкам – сярэдзіна – канец XVI ст.;

– перапланіроўка гарадской забудовы і ўзвядзенне мураванага замка з гарадской бастыённай фартыфікацыйнай сістэмай – канец XVI ст. – 1630-я гг. Горад атрымоўвае выразны падзел на кварталы з сакральнымі архітэктурнымі дамінантамі кожнай з канфесій, якія маркіруюць этна-канфесійную і сацыяльную структуру гарадской супольнасці;

– узнаўленне і рэканструкцыя пашкоджаных пасля Паўночнай вайны гарадскіх фартыфікацыйных збудаванняў – сярэдзіна XVIII ст. Рэзкае скарачэнне гарадскога насельніцтва і заняпад сядзібных комплексаў.

Першую згадку Быхава ўтрымлівае “Спіс Рускіх гарадоў дальніх і бліжніх”, які датуецца В.Л. Яніным паміж 1375 і 1381 гг. Быхаў у гэтай крыніцы фігуруе як умацаваная сядзіба, “град”.

У канцы XV – пачатку XVI стст. адначасова на тэрыторыі горада функцыянавала да трох магнацкіх сядзіб. З другой паловы XVI ст. цэнтрам горада з'яўляўся замак, ад якога радыяльна ў паўночным, паўднёвым і часткова заходнім напрамках разрастаўся горад з новай правільнай планіроўкай. У XVII ст. замак пераўтвараецца ў палаца-замкавы ансамбль, будуецца бастыённая фартыфікацыйная сістэма вакол горада, сінагога, касцёл з каменнымі келлямі “латэранскіх канонікаў рэгулярных”. У гэты ж час разбудоўваецца Лявонаўская слабада, якая разам з паўднёвымі пасадамі была спалена падчас казацка-сялянскай вайны 1648–1651 гг. і вайны Расіі з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг. XVIII ст. – час максімальнай разбудовы горада. Перабудоўваюцца фартыфікацыйныя ўмацаванні пасля іх знішчэння ў 1707–1714 гг. расійскімі войскамі. Маёнтак Белая Гара пачынае ўключацца ў горад, становіцца яго складовай часткай.

У XVII ст. “места” ўмоўна было падзелена на чатыры часткі адпаведна канфесійнай прыналежнасці жыхароў горада: праваслаўныя, каталікі, уніяты і яўрэі. Апошнія, згодна з агульнай практыкай, мяшчанамі не з'яўляліся. На падобную градацыю ўскосна ўказвае сектарнае размяшчэнне культавых пабудоў – асноўных архітэктурных дамінант у межах горада. Між іншым, асноўная гандлёвая плошча таксама падзяляла горад на дзве часткі: праваслаўныя жылі на поўдні, уніяты – на захадзе, яўрэі – на паўночным захадзе, а каталікі і лютэране – на паўночным усходзе.

Акрамя замка, на працягу XVII–XVIII стст. у горадзе існавалі архітэктурныя дамінанты – мураваныя і культавыя пабудовы. Да іх адносяцца касцёльны комплекс (2 каменныя пабудовы), сінагога (каменная), уніяцкая і праваслаўныя цэрквы (у розныя часы драўляныя і драўляна-каменныя).

У складзе горада меліся прыватнаўласніцкія юрыдыкі, да якіх таксама адносілі і землі балоння (заліўны поплаў) з сенажацямі, якія не ўваходзілі ў гарадскую забудову. Юрыдыкамі валодалі як мясцовая шляхта, так і рыма-каталіцкі касцёл, а магчыма і іншыя юрыдычныя і фізічныя асобы.

Першапачаткова горад меў толькі вал (магчыма два) і сухі роў. З XVII ст. – роў з вадой і бастыённую сістэму, якая спалучала бастыёны, равеліны, горнверк і ішыя элементы тагачаснай фартыфікацыйнай сістэмы (кашы-габіёны і калоды з коллем). Гарадскі вал быў забяспечаны уязнымі мураванымі брамамі. Усе бастыённыя ўмацаванні разам з брамамі былі моцна пашкоджаныя, часткова зруйнаваныя/узарваныя напрыканцы Паўночнай вайны. Часткова іх аднавілі к сярэдзіне XVIII ст.

Горад і замак на працягу свайго існавання змянялі прасторавую лакацыю два разы: першапачаткова двор князёў Друцкіх размяшчаўся на тэрыторыі мысавага гарадзішча за 800 м на поўдзень ад сучаснага мураванага замка (XIV – пачатак XVI стст.). Іеранім Хадкевіч выканаў перанос замка і горада ў паўночным напрамку (1560-я гг.). Новы драўляна-земляны замак быз закладзены на тэрыторыі сучаснага каменнага ці на тэрыторыі былога касцёла Непарочнага зачацця Найцсвяцейшай панны Марыі, Святога Казіміра і біскупа Аўгусціна. Пры Яне Карале Хадкевічы і яго спадкаемцах горад быў перапланаваны і закладзены новы мураваны замак (1600–1630-я гг.). У 1630-х гг. на левым беразе Дняпра была заснавана Лявонаўская слабада, а ў XVIII ст. на поўнач ад гарадскіх умацаванняў існаваў фальварак Белая Гара.

Знаходкі керамічнага і нумізматычнага матэрыялу дазваляюць гаварыць пра распаўсюджванне пасадаў на значную адлегласць (да 750 м) на поўнач і поўдзень ад гарадскіх умацаванняў. Найбольш старажытныя сярэднявечныя матэрыялы знойдзены на тэрыторыі замка, касцёла і паўночна-ўсходняй часткі гандлёвай плошчы (матэрыялы канца XV–XVI стст.). Між тым, на Паўднёвым гарадзішчы і замчышчы былі выяўлены матэрыялы ранняга жалезнага веку і старажытнарускага часу.

Эвалюцыя Быхава як населенага пункта была абумоўлена наступнымі фактарамі:

– геаграфічнымі (размяшчэнне на рацэ Днепр – важнейшым транзітным шляху "з вараг у грэкі", у эпоху Позняга Сярэднявечча, – важнай гандлёвай транзітнай артэрыі, якая працягвала выкарыстоўвацца ў працэсе гандлёвай камунікацыі на ўнутраным і знешнім рынку);

– прыродна-кліматычнымі (змены клімату, эпідэміі);

– знешнепалітычнымі (татарская экспансія, далучэнне Падняпроўя да ВКЛ, войны з Маскоўскай дзяржавай);

– сацыяльна-палітычнымі (феадалізацыя, фарміраванне рыцарскага і шляхецкага саслоўя на землях ВКЛ і РП, як вынік – узнікненне магнацкай прыватна-ўласніцкай латыфундыі);

– агульнаеўрапейскімі ўрбаністычнымі тэндэнцыямі эпохі Рэнесансу і барока (ідэальны горад-крэпасць, гарадская забудова, палаца-замкавы ансамбль).

Быхаў узнік з сельскага паселішча, з цягам часу вылучыўшыся ў цэнтр сельскай акругі. Верагодна, яшчэ ў старажытнарускі час гэта паселішча адыгрывала пэўную ролю як гандлёвая кропка на Дняпроўскім шляху "з вараг у грэкі". Аб гэтым сведчаць курганныя могільнікі ў ваколіцах Быхава, якія ўражваюць сваім багаццем. З уваходжаннем Падняпроўя і ўкраінскіх зямель у склад ВКЛ Быхаў апынуўся ў памежным становішчы, выступаючы як парубежны населены пункт. З гэтай прычыны ён мог быць перададзены ў якасці леннага, ці беніфіцыяльнага, валодання, што дало падставы для пераўтварэння яго ў абарончую кропку-"двор". З пераходам у валоданне Хадкевічаў Быхаў пачынае інтэнсіўна развівацца і эвалюцыянуе ў паўнавартасны горад з паступовай разбудовай замка/замкаў і гарадской забудовы па апошніх еўрапейскіх інавацыйных тэхналогіях у фартыфікацыі і горадабудаўніцтве.

Асноўныя функцыі Быхава ў часы Хадкевічаў і Сапегаў – абарончая, рэпрэзентацыйная, і эканамічная. Быхаў з'яўляўся цэнтрам адной з найбуйнейшых магнацкіх латыфундый, размешчаных на ўсходнім памежжы Рэчы Паспалітай, адначасова горад быў галоўным збройніцкім цэнтрам у рэгіёне. З XVII па канец XVIII стст. горад адыгрываў ролю асноўнага мілітарнага цэнтра на Падняпроўі з-за першакласных умацаванняў і наяўнасці збраёвых майстэрняў (у тым ліку і людвісарні). Істотную крыніцу прыбыткаў для гарадской казны складаў менавіта экспарт зброі і рыштунку.

Улічваючы максімальную адаптацыю гарадской забудовы да фартыфікацыйных функцый, наяўнасць першакласнай абарончай сістэмы ўмацаванняў, мясцовы выраб узбраення і пастаяннага кантролю ўладароў за абараноздольнасцю горада, можна меркаваць аб першапачатковай функцыі Быхава як горада-крэпасці. Другая функцыя – рэпрэзентацыя магутнасці гаспадароў паселішча. Горад размешчаны на высокім левым беразе Дняпра – гэта аптымальнае месца для будавання крэпасці, якая не з'яўляецца памежным фарпостам. Судаходны Днепр усё ж не забяспечваў тавараабарот, роўны Заходняй Дзвіне ці Нёману, адкуль тавар ішоў у Балтыку, але быў дастатковым для забеспячэння прыфрантавых рэгіёнаў у выпадку вайсковага канфлікту як транспартная артэрыя. Функцыя эканамічнага, адміністрацыйнага і рэлігійнага цэнтру выконвалася ў апошнюю чаргу.

Быхаў выступаў у якасці мілітарнага цэнтра на Падняпроўі. Менавіта тут знаходзілася людвісарня і неабходная колькасць майстроў, якімі выраблялася як разнастайная агняпальная зброя (у тым ліку і гарматы), халодная зброя, ахоўнае ўзбраенне, вайсковы рыштунак, так і порах, ядры, кулі і іншыя боепрыпасы. Акрамя таго, ў горадзе прысутнічалі ўніверсальныя прадпрыемствы (тартак, бровар, млын і г.д.).

Быхаў, як і любы сярэднявечны горад, меў комплекс рамесных спецыяльнасцей, якія забяспечвалі жыццяздольнасць усіх катэгорый насельніцтва, між тым, рамесная спецыялізацыя горада – выраб узбраення і вайсковага рыштунку. Быхаўскі гарнізон складаўся з наёмнікаў, мясцовых выбранцаў і апалчэнцаў (падчас аблог). Камбатанты забяспечваліся за кошт магнатаў, апалчэнцы – за ўласны кошт. Баяздольнасць гарнізона кантралявалася і падтрымлівалася на дастатковым узроўні.

Выпадае казаць пра наступныя стадыі эвалюцыі Быхава як паселішча (яны ўплывалі і на ролю, якую Быхаў адыгрываў у рэгіёне): сельскае паселішча, феадальная сядзіба (двор), умацаваны двор-замак, месца з дваром-замкам, цэнтр латыфундыі з замкам, горад з замкам – сталіца графства, горад-крэпасць з палацам-замкам – сталіца графства.

## ЛІТАРАТУРА

1. Тихомиров, Н.М. Список русских городов дальних и ближних / Н.М. Тихомиров // Исторические записки. – М., 1952. – Т.40. – С. 214–259.
2. Насевіч, В.Л. Род князёў Друцкіх у гісторыі Вялікага княства Літоўскага (XIV – XVI стст.) / В.Л. Насевіч // Старонкі гісторыі Беларусі / М.М. Крывальцэвіч [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – С. 83–104.

3. Дедук, А.В. “Список русских городов дальних и ближних”: история изучения / А.В. Дедук // Русский книжни. 2014. – М., 2015. – С. 129-141.
4. Янин, В.Л. Новгород и Литва: пограничные ситуации XIII–XV веков / В.Л. Янин. – М. : Изд-во Моск. ун-та, 1998. – 216 с.
5. Алексеев, Л.В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии X – XIII вв.) / Л.В. Алексеев. – М. : Наука, 1966. – 296 с.
6. Алексеев, Л.В. Смоленская земля в X – XIII вв. / Л.В. Алексеев. – М. : Наука, 1980. – С. 260.
7. Волкаў, М.А. Быхаў у першай палове XVII ст. / М.А. Волкаў // Сапегі: асобы, кар’еры, маёнткі : зб. навук. арт. – Мінск, 2018. – С. 167–194.
8. Левко, О.Н. Средневековые территориально-административные центры северо-восточной Беларуси: Формирование и развитие / О.Н. Левко. – Минск : Бел. навука, 2004. – 280 с.
9. Трусаў, А.А. Кароткая гісторыя архітэктуры Беларусі / А.А. Трусаў. – Мінск : Харвест, 2015. – 464 с.
10. Wolff, J. Kniaziowie litewsko-ruscy od konca chternastego wieku / J. Wolff. — Warszawa : Drukiem J. Filipowicza, 1895. – 724 s.
11. Бабятыньскі, К. Падняпроўскія крэпасці ў сістэме абароны ўсходняй мяжы Вялікага Княства Літоўскага – XVI – палова XVII стагоддзя / К. Бабятыньскі // ARCHE. – 2014. – № 12. – С. 290–304.
12. Грицкевич, А.П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. / А.П. Грицкевич. – Минск : Наука и техника, 1975. – 248 с.
13. Бохан, Ю.М. Мястэчкі і працэсы ўрбанізацыі на землях Беларусі ў XV–XVIII стст. / Ю.М. Бохан ; уклад. М.А. Волкаў. – Мінск : Беларуская навука, 2018. – 292 с.
14. Бохан, Ю.Н. Урбанистические процессы в Великом княжестве Литовском в 14–18 вв. / Ю.Н. Бохан // Города, местечки и замки Великого княжества Литовского : энцикл. / ред. совет: Т.В. Белова (пред.) [и др.]. – Минск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – 312 с.
15. Места / Вялікае княства Літоўскае : энцыкл. У 2 т. – Мінск : БелЭн, 2007. – Т.2: Кадэцкі корпус – Яцкевіч / Рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал.рэд.) [і інш.]. – 2-е выд. – С. 302.
16. Рубцов, Н.Н. История литейного производства в СССР / Н.Н. Рубцов. –2-е изд. – М., 1962. – Ч. 1. – С. 302.
17. Штыхаў, Г.В. Горад / Г.В.Штыхаў // Археалогія Беларусі: энцыкл. У 2 т. – Мінск : Беларус. энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 1: А-К / рэдкал.: Т.У. Бялова (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 256–257.
18. Янушкевич, А.Н. Ливонская вайна 1558–1570 гг. и Великое княжество Литовское / А.Н. Янушкевич. – Минск : Медисонт, 2013. – 362 с.
19. Ткачоў, М.А. Замкі і людзі / М.А. Ткачоў ; пад рэд. Г.В. Штыхава. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 184 с.
20. Шкапляроў, Ю.П. Ідэальны горад-крэпасць. Ваенная гісторыя Старога Быхава ў XVII стагоддзі / Ю.П Шкапляроў, М.А. Волкаў, Р.Дз. Галынскі ; пад навук. рэд. д-ра гіст. навук, праф. І.А. Марзалюка ; Мін-ва ўнутраных спраў Рэсп. Беарусь. – Магілёў : Магілёўскі інстытут МУС, 2018. – 140 с.
21. Акты издаваемые Виленскою комиссіею для разбора древних актов : в 39 т. – Вильна : Тип. Губ. правл., 1865 – 1915. – Т. 4: Акты Брестского городского суда. – 1870. – 687 с.
22. ПСРЛ. – Т. 32.: Хроники: Литовская и Жемойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцырного. – М. : Наука, 1975. – 235 с.
23. ПСРЛ. – Т. 35.: Летописи белорусско-литовские / Сост. и авт. предисл. Н.Н. Улащик. – М. : Наука. 1980. – 306 с.
24. Слюнькова, И.Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья XVII – середины XIX в. / И.Н. Слюнькова. – Минск : Навука і тэхніка, 1992. – 144 с.
25. Галынскі, Р.Дз. Тыповыя рамесныя вырабы з Быхава XVI – XVIII стст. (па дадзеных пісьмовых і археалагічных крыніц) / Р. Дз. Галынскі // Веснік МДУ імя А.А. Куляшова. Сер. А, Гуманітарныя навукі (гісторыя, філасофія, філалогія). – 2019. – С. 20–28.
26. Галынскі, Р.Дз. Агульны агляд комплекса артэфактаў з археалагічных даследаванняў на тэрыторыі гістарычнага цэнтра г. Быхава / Р.Дз. Галынскі // Весн. Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Сер. А, Гуманітарныя навукі. – 2019. – № 9. – С. 115–122.
27. Абецедарский, Л.С. Белорусы в Москве XVII в.: из истории белорусско-русских связей / Л.С. Абецедарский. – Минск : Изд-во БГУ им. В. И. Ленина, 1957.
28. Абецедарский, Л.С. Белоруссия и Россия: очерки русско-белорусских связей второй половины XVI – XVII вв. / Л.С. Абецедарский. – Минск : Вышэйшая школа, 1978. – 256 с.
29. Галынскі, Р.Дз. Побытавая кераміка горада Быхава XVII – XVIII стст. / Р.Дз. Галынскі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў XI Міжнар. навук. канф. ; уклад.: А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. – Магілёў, 2019. – С. 44–50.
30. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічным наглядзе на аб’екце “Строительство сетей теплоснабжения к зданию прихода храма Святой Живоначальной Троицы г. Быхова” ў 2013 г. (Дамова Інстытута Гісторыі НАН Беларусі з настаяцелем храма Святой Жываначальнай Тройцы г. Быхава ад 26 снежня 2013 г.) / Р.Дз. Галынскі. – Магілёў, 2014.
31. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічных разведках 2012 г. / Р.Дз. Галынскі. – Магілёў, 2013.
32. Галынскі, Р.Дз. Справаздача аб археалагічных разведках і раскопках у гістарычным цэнтры г. Быхава Магілёўскай вобласці ў 2013 г. / Р.Дз. Галынскі. – Магілёў, 2014.
33. Опись Старо-Быховскому приходскому костелу и плебании, преображенным из помонастырских ксендзов-каноников регулярных, а также имуществу оных принадлежащему // Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. – Ф. 149. Воп. 3. Спр. 189. Арк. 15.
34. Волкаў, М.А. Панарама Старога Быхава другой паловы XVII ст. / М.А. Волкаў // Беларускі гістарычны часопіс. – 2013. – № 5. – С. 16–24.

35. Галынскі, Р.Дз. Ахова тулава і канечнасцяў у канцы XVI – XVII стст. На прыкладзе Старога Быхава і Магілёва (па дадзеных археалагічных і пісьмовых крыніц) / Р.Дз. Галынскі // Гісторыя Магілёва: мінулае і сучаснасць : зб. навук. прац удзельнікаў IX Міжнар. навук. канф. ; уклад.: А.М. Бацюкоў, І.А. Пушкін. – Магілеў, 2015. – С. 30–35.
36. Галынскі, Р.Дз. Агульны агляд комплекса ўзбраення горада Быхава XVI – XVII стст. (па пісьмовых крыніцах) / Р.Дз. Галынскі // Романовские чтения – 10 : сб. ст. Междунар. науч. конф., посвящ. 80-летию со дня основания исторического факультета / Под общ. ред. И. В. Шардыко. – Могилев, 2015. – С. 231–233.

*Пастуліў 14.05.2020*

## THE CITY OF BYKHOV IN THE XIV–XVIII CENTURIES. (EMERGENCE, DEVELOPMENT, ECONOMY, MILITARY AFFAIRS AND ROLE IN THE REGION)

***R. GALUNSKY***

*The city of Bykhov is one of the less historically studied cities of the Mogilev Dnieper region, despite the fact that the city played an important role in the military and political life of the Grand Duchy of Lithuania and the Commonwealth in the XIV–XVIII centuries. At the same time, the history of the emergence of this locality and its evolution are still almost unknown. Based on the analysis of written, cartographic and archaeological sources, it was possible to establish several stages of its evolution, as well as changes in the role in the region as a settlement.*

***Keywords:*** *Bykhov, the emergence of the city, the evolution of the city, military affairs, the military center, the "dvor", the fortified city, latifundia.*